Сянькевіч В.

# АПОШНІ ВЫСТРАЛ

У маі 1944 года у ваенным лагеры, дзе фарміраваліся часці бранятанкавых войск, паявіўся незвычайны полк. Яго называлі інжынерна-танкавым. Быў ён укамплектаваны звычайнымі трыццацьчацвёркамі са зманціраваннымі на іх супрацьмінными тралами ПТ-5. Прызначаліся танкі для праробліванння праходаў у мінных палях.

Першы полк такога назначэння быў створаны і праверaны ў баявых умовах. Яго асабіста ўзначальваў вынаходнік трала і канструктар танка-тральшчыка Герой Савецкага Саюза палкоўнік П. М. Мугулёў. Цяпер вось ён фарміраваў другую такую часць на базе 253-га Гомельскага танкавага палка.

У яго саставе ваяваў і камандзір танкавага ўзвода малодшы лейтэнант Павел Ананьевіч Крыванос.

У сярвдзіне чврвеня 1944 года полк узнялі па трывозе. Эшалоны імчалі на захад. Мінулі Вязьму, Смаленск. Значыць, цэль іх – Беларусь. І застукала радасна сэрца Паўла Крываноса: а, можа, пашанцуе і прывядзе франтавая дарога ў родны Клічаў, дзе засталіся яго маці, бацька, сёстры.

Але трапіў малады танкіст на Віцебшчыну.

І вось прыйшла раніца 23 чзрвеня. Загаварыла артылерыя. Пайшлі ў атаку танкі.Аперацыя "Баграціён" пачалася.

Прыступіў да выканання сваей задачы і ўзвод П. Крываноса. Спачатку ўсё ішло нармальна. Але на падыходзе да ракі Сухадраўкі трал яго танка трапіў на ўзмоцнены зарад і пазбавіўся сваіх "шпор". Калона стала. Ні аб’ехаць, ні разгарнуцца – навокал міны. А праціўнік дабаўляе і дабаўляе агню, Увага ўсіх сканцэнтравалася на танку Крываноса. Ад яго чагосьці чакалі, хаця разумелі, што "бяззубым" тралам праход не праробіш.

Выйсце было знойдзена хутка. Замест адбітых "шпор" экіпаж накруціў на трал сталісты дрот. Танкавая калона, узначальвала якую машына Крываноса, зноў рушыла ўперад...

Нашы часці набліжаліся да Багушэўска. Інжынерна-танкавая рота І. А. Канакова зняла тралы і рыхтавалася да атакі ў якасці звычайнага лінейнага падраздзялення. Бой успыхнуў раптоўна і імгнена ператварыўся ў жорсткую схватку. Крыванос уварваўся на ўскраінную вуліцу, вёў прыцэльны кулямётна-гарматны агонь, закрываў сваёй бранёй амбразуры дзотаў, забяспечваючы пяхоце рух наперад. А хутка прабіўся да чыгунк. Некалькімі выстраламі разбіў галоўны пуць, не даўшы ўйсці нямецкім эшалонам.

У той жа дзень з віцебскага "катла" вырвалася нямецкая дывізія і пайшла граміць тылы нашых войск і шпіталі. А ў камандавання 5-й

арміі не было свабодных ні сіл, ні сродкаў. Войскі або змагаліся ўперадзе, або грамілі фашыстаў у "катле". Не задзейнічаны быў толькі 253-ці Гомельскі інжынерна-танкавы полк, ды ля Віцебска з невялікай групай воінаў затрымаўся камандзір 184-й стралковай дывізіі генерал Б. Б. Гарадавікоў. У яго распараджэнні былі стралковы батальён і батарэя палкавых гармат. Гэтыя сілы і вырашылі кінуць супраць немцаў, што вырваліся з "катла".

Вось што расказваў аб гэтым І. А. Канакоў:

"Рота зрабіла 30-кіламетровы марш, выйшла да Бураносавага лесу. У шляху мяне дагнаў генерал Гарадавікоў і паставіў задачу заняць абарону на вышынях і блакіраваць праціўніка ў лесе, не выпускаючы на дарогі. Прыбылі на месца. Становішча складанае У лесе сядзяць немцы, злева гарыць наш шпіталь. Фашысты нас убачылі і кінуліся ў атаку. Адбіліся... Тут падышлі астатнія танкі палка, пяхота, артылерыя. Стала лягчэй, але баі ўзмацняліся...".

З лесу да вышыні, дзе былі танкі Крываноса, рухалася некалькі ланцугоў нямецкай пяхоты. Усе ў касках, рукавы закасаны да локця, у кожнага аўтаматы, за поясам гранаты, у галянішчах ботаў – запасныя ражкі. А на вышыні толькі тры нашых машыны ды аддзяленне стралкоў. Крыванос скамандаваў танкістам:

– Адбіваць атаку з месца, боепрыпасаў не шкадаваць!

А камандзіру аддзялення стралкоў параіў:

– Не ўвязвайцеся ў бліжні бой, адбівайцеся з акопаў, а то заціснуць сваёй масай.

Праціўнік агонь адкрыў першым. А потым раздалося гучнае рускае "Ура!" Спачатку савецкія воіны разгубіліся. Але хутка зразумелі, што гэта ўласаўцы – і насустрач атакуючым хлынуў лівень сталі і свінца. Атака была адбіта.

У гэты дзень праціўнік прадпрыняў яшчэ дзве спробы прарвацца. Але безвынікова. Бой працягваўся і на трэці дзень. Але па напалу яго адчувалася, што фашысты пачалі выдыхацца. Значыць, трэба самім пераходзіць у атаку.

Хутка паследваў і баявы загад. Але першую атаку немцы адбілі. Перад другой правялі разведку. Састаў яе быў невялікі – узвод танкаў П. Крываноса. Праімчаліся гэтыя машыны па ўскрайку лесу, выклікалі агонь, дапамаглі выявіць агнявыя сродкі і сканцэнтраванне нямецкіх сіл. Тут жа пачалася атака.

Танкі павёў камандзір часці падпалкоўнік С. І. Солцер. Трэба было нанесці рашаючы ўдар, і таму камандзір палка быў у баявых парадках, каб усё бачыць, аператыўна ўмешвацца ў ход бою. Яго танк вёў малодшы лейтэнант Ю. Салагуб, кіраванне па двух радыёстанцыях забяспечваў начальнік сувязі, аўтар гэтых радкоў.

Атака развівалася нармальна. І, раптам, калі да ўскрайку лесу было два дзесяткі метраў, з кустоў паказалася жэрла фашысцкай гарматы. Яно нацэлілася прама ў борт машыны камандзіра часці.

Першым выявіў гармату механік-вадзіцель танка Крываноса. Ен крыкнуў у перагаворнае прыстасаванне:

– "Фердынанд" па курсу, побач!

Крыванос імгнення разгарнуў свій перыскоп і ўбачыў фашысцкую самаходку. Усё вырашылі імгненні. Сваю гармату не паспееш павярнуць, таран не прымяніць. Выйсце магло быць толькі адно: прыкрыць сваім танкам машыну камандзіра. І Крыванос скамандаваў:

– Механік! Газу! Уперад!.. Хутчэй!..

Выстралу "фердынанда" танкісты не чулі. Але ўдар снарада па брані быў моцны. Машына Крываноса як укопаная спынілася. Але праз нейкі час яе гармата развярнулася. Ля абрэза ствала бліснула полымя. З "фердынандам" было пакончана. І адразу ж у радыёсетцы палка раздаўся голас Крываноса:

– Узводу рухацца па ранейшаму маршруту, выконваць задачу!

Ніхто тады не ведаў, што гэта быў апошні выстрал Крываноса. І каманду сваю ён падаў, ужо сцякаючы крывёй і губляючы прытомнасць.

У гэты дзень рэшткі фашысцкай дывізіі здаліся. Танкісты рушылі да Маладзечна. А на могільніку вёскі Шолкі навекі застаўся лейтэнант Павел Крыванос. Мужнаму воіну Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У раёне помняць і ўшаноўваюць свайго земляка. Яго імем названы вуліца і школа ў Клічаве, піянерская дружына. У Музеі народнай славы яму прысвечана экспазіцыя.

**Сянькевіч, В. Апошні выстрал / В. Сянькевіч // Магілёўская праўда. — 1989. — 20 чэрвеня. — С. 3.**